Макейчык Аляксей.

# Блытаніна.

Дзеючыя асобы:

**Дзяніс**

**Марта**

**1.**

**Дзяніс.** Скажыце, вы псіхолаг ці псіхатэрапеўт?

**Марта.** Я, у прынцыпе, і так і так магу. Вам хто патрэбны?

**Дзяніс.** Не ведаю, думаю, вы як спецыяліст мне падкажаце.

**Марта.** Давайце псіхатэрапію паспрабуем.

**Дзяніс.** Давайце, толькі я зараз трохі дзіўна сябе адчуваю.

**Марта.** Вам здаецца гэта ненармальным?

**Дзяніс.** Дарма я гэта распачаў. Я, мабыць, лепей пайду.

**Марта.** Што менавіта вас бянтэжыць у гэтай сітуацыі?

**Дзяніс.** Шчыра кажучы, вашы пытанні, ваша імя і ўсе гэтыя абставіны.

**Марта.** Што не так з іменем?

**Дзяніс.** Яно нейкае занадта мудрагелістае для псіхатэрапеўта. Не здаецца?

**Марта.** А для псіхолага?

**Дзяніс.** Для псіхолага, думаю, самае то.

**Марта.** Вы лічыце, мне трэба было ўзяць псеўданім?

**Дзяніс.** Гэта было яшчэ больш дзіўна.

**Марта.** Хаціце памаўчаць?

**Дзяніс.** За 25 даляраў?

**Марта.** Вы маеце права.

**Дзяніс.** Так, хачу.

**Марта.** Калі будзеце гатовы, можаце пачаць гаворку. Пачаць можна з найпрасцейшага: чаму вам захацелася атрымаць дапамогу.

**Дзяніс.** А зараз можна проста маўчаць?

**Марта.** Калі ласка.

**2.**

**Дзяніс.** Мне проста мінулы раз было неяк няёмка. Выйшла неяк па-дурному.

**Марта.** Не. Зусім не па-дурному. Не хвалюйцеся.

**Дзяніс.** Ну так, канечна, нармальна. Але тое, што я прыйшоў зараз пра гэта сказаць, гэта ўжо дакладна так сабе.

**Марта.** Усё нармальна.

**Дзяніс.** Не. Усё правільна. Дарма ўсё гэта распачаў. Гэта з самага пачатку было неяк… Прабачце, я, мабыць, пайду.

**Марта.** Можа вады?

**Дзяніс.** Вада была б дарэчы.

**Марта.** Сядайце пакуль на канапу.

**Дзяніс.** А вы надоўга?

**Марта.** Не, проста вады прынясу.

**Дзяніс.** О, дзякуй! Халодненькая… Зараз мне, мабыць, лепей пайсці. Я вам нешта вінен?

**Марта.** Вы ж не адмянілі сеанс, таму…

**Дзяніс.** Так, разумею. Вось.

**Марта**. Вы праўда некуды бяжыце? Проста вы маглі б пасядзець тут... Раптам вам захочацца расказаць.

**Дзяніс.** Што?

**Марта.** Чаму вы вырашылі звярнуцца за дапамогай.

**Дзяніс.** Гэта так неяк гучыць, ведаеце…

**Марта.** Як?

**Дзяніс.** На сам рэч, шчыра кажучы, мне трэба бегчы. Прабачце, каб не справы, я б, вядома, з радасцю застаўся.

**3.**

**Дзяніс.** Проста хацеў сказаць, што ў звычайным жыцці гэта ўсё не пра мяне.

**Марта.** Вы бачыце ў псіхатэрапіі нешта незвычайнае для вашага жыцця?

**Дзяніс.** Цяжка сказаць. Але прынамсі я хацеў сказаць пра іншае…

**Марта.** Прабачце, калі я вас перабіла.

**Дзяніс.** Тады ці зараз?

**Марта.** Абодва разы.

**Дзяніс.** Не страшна...

**Марта.** Але ўсё роўна. Мне будзе прыемна, калі вы мне прабачыце.

**Дзяніс.** У звычайным жыцці я не плачу 25 даляраў, каб моўчкі сядзець на канапе альбо выпіць шклянку вады.

**Марта.** Выдатна вас разумею. Я таксама.

**Дзяніс.** Бачыце. Тады і вам было б дзіўным, каб знянацку вы пачалі б сябе так паводзіць.

**Марта.** Каб знянацку, то, зразумела, хутчэй за ўсё так.

**Дзяніс.** Я і кажу.

**Марта.** Можа мы маглі б перайсці на "ты"? Гэта магло б трошкі спрасціць...

**Дзяніс.** Зносіны. Так, так. Я разумею. Мне дакладна было б прасцей называць вас на «ты».

**Марта.** І мне вас.

**Дзяніс.** Так зараз?

**Марта.** Як хочаце. Можам з наступнага разу пачаць.

**Дзяніс.** Вам лепей ведаць. Вы жа доктар.

**Марта.** Ды якое там... Доктар... Я вас прашу..

**Дзяніс.** Не бянтэжцеся. Ні кожны хірург 25 даляраў за гадзіну зарабляе.

**Марта.** Гледзячы дзе.

**Дзяніс.** У сярэднім па краіне.

**Марта.** У сярэднім па краіне так, але ж яны хірургі...

**Дзяніс.** Ніколі хірургам ні мог бы быць. Уявіце, усе гэтыя швы, органы, кроў цэлы дзень...

**Марта.** Нават уяўляць не хачу.

**Дзяніс.** І мне неяк мутарна стала.

**Марта.** І ўсё гэта часам нават за 25 даляраў ў дзень. Фух...

**Дзяніс.** Героі.

**Марта.** Затое ім можна разбэшчанымі быць.

**Дзяніс.** У сэнсе?

**Марта.** Ім можна курыць, ёсць такія, што нават і да бутэлькі прыкладаюцца.

**Дзяніс.** А вы?

**Марта.** А мы не. Гэта як бы супярэчыць... Ну, вы самі разумееце...

**Дзяніс.** Ах так, вядома, разумею.

**4.**

**Марта.** Ты калі мне першы раз званіў, казаў, што з табой панічная атака адбылася.

**Дзяніс.** Адразу неяк палягчэла, з-за таго, што перайшлі на «ты».

**Марта.** Дробязь.

**Дзяніс.** Так. Я казаў, што ў мяне была панічная атака.

**Марта.** Як гэта было?

**Дзяніс.** Калі гэта адбылося, я не ведаў, што гэта панічная атака. Я думаў, што паміраю.

**Марта.** Небарака.

**Дзяніс.** Я ехаў раніцай на працу. І раптам пачаў задыхацца. І гэта было вельмі дзіўна, таму што я нават не куру.

**Марта.** Ты быў за рулём?

**Дзяніс.** Так, я быў на сваёй машыне.

**Марта.** І што ты рабіў?

**Дзяніс.** Спыніў машыну і вызваў «хуткую».

**Марта.** Скажы ты! Як усё правільна зрабіў!

**Дзяніс.** Але яны вельмі доўга ехалі, таму, пакуль яны даехалі, я ўжо трохі ачуняў. Яны мяне нават у бальніцу не забралі.

**Марта.** А што казалі?

**Дзяніс.** ВСД, ВСД, ВСД, ВСД, ВСД і плявузгалі. А пасля далі валяр'янкі і з'ехалі.

**Марта**. Усё правільна зрабілі, калі валяр'янкі далі.

**Дзяніс.** Я ўжо дома ў інтэрнэце паглядзеў пра ВСД і ўсё такое. Там усе кажуць, што трэба правільна дыхаць і да псіхатэрапеўта звярнуцца.

**Марта.** Пакажы, як дыхаеш.

**Дзяніс.** Вось... Неяк так.

**Марта.** У цэлым нармальна дыхаеш. Але можна яшчэ павольней.

**Дзяніс.** Так?

**Марта.** Не трэба тут – дома патрэніруешся.

**Дзяніс.** Добра.

**Марта**. Напярэдадні, перад першай атакай можа нешта ў жыцці здарылася? Што магло быць імпульсам... Ну, ты разумееш...

**Дзяніс.** Здаецца, я помню, так... Напярэдадні мне прысніўся сон вельмі дзіўны і трывожны. Быццам я малы, натуральна, гадоў адзінаццаць, і я знайшоў на стадыёне кеды. Нехта іх забыўся, зусім новыя, і дакладна такія, пра якія я заўсёды марыў. І нікога наўкол няма, так што я без праблем магу іх узяць, але яны 36 памеру, а ў мяне ўжо, як год, 38. І мне ад таго стала так горка, што я заплакаў. Я плакаў, плакаў, і прачнуўся ад таго, што плачу. Але дзіўным было тое, што я насамрэч плакаў, дарослы, а не толькі маленькі хлапчук у сне.

**Марта.** Гэта так кранальна. Дай я цябе абдыму. Прызнайся, хацеў, як у кіно?

**Дзяніс.** Вельмі.

**Марта.** Мы можам. Калі хочаш – можна і так. Я проста хачу сказаць, што ты вырашаеш.

**Дзяніс.** А як бы ты раіла?

**Марта.** Так я і ня ведаю, можна і так. Але гэта мы ўжо іншым разам абмяркуем, ужо час.

**Дзяніс.** Так, вядома.

**Марта.** У нас сёння маленькі юбілей.

**Дзяніс.** Юбілей?

**Марта.** Я так жартую. Проста чатыры сеансы – гэта сто даляраў. І гэта мяне цешыць.

**Дзяніс.** Насамрэч. Я адразу і не ўцяміў.

**Марта.** Табе, дарэчы, таксама трэба вучыцца радавацца простым рэчам. Гэта вельмі дапамагае і ўраўнаважвае. Засвоіў. РАДАВАЦЦА

**Дзяніс.** Засвоіў.

**Марта.** Не хвалюйся, калі забудзешся, я нагадаю на наступным сеансе.

**Дзяніс.** Добра.

**Марта.** Тады да сустрэчы.

**Дзяніс.** Да сустрэчы.

**5.**

**Марта.** Можа, здарылася яшчэ што, што магло так цябе эмацыйна ўсхваляваць? Павер, не таму кажу, быццам не веру, што табе той сон з красоўкамі прысніўся.

**Дзяніс.** З кедамі.

**Марта.** Гэта не важна.

**Дзяніс.** Як скажаш.

**Марта.** Проста звычайна...Ведаеш, усе гэтыя праблемы, што прыводзяць, ну ты разумееш... Яны у цябе быццам спяць. Сабраліся у такі тугі неспакойны згустак у цябе і павольна так капошацца, нібыта чэрві ў матку. Чакай. Я запішу «тугі неспакойны згустак». Не кепска, так?

**Дзяніс.** Ты кнігу пішаш?

**Марта.** Ты думаеш, варта?

**Дзяніс.** Інакш, не бачу сэнсу запісваць?

**Марта.** Не звяртай увагі. Так. Пра што гэта я...

**Дзяніс.** Тугі трывожны згустак.

**Марта.** Дзякуй. Так вось. Усё гэта ў цябе дрэмле, пакуль не адбудзецца нейкая падзея якая, скажам, таксама спрабуе залезці ў гэты згустак. Твой арганізм быццам запіхвае туды ўсё дрэннае, каб ты мог нармальна функцыяніраваць. Але гэта апошняя падзея. Яна наадварот, не хаваецца там, а будзіць усё тое, што ты ўсё жыццё хаваў. Гэты клубок, быццам у гульне дзіцячай. Помніш тую гульню? Дзе ўсе бяруцца за рукі і заблытваюцца. Усё перакручана і заблытана... рукі, цела, усе не да месца стаяць. А той, хто водзіць, павінен увесь гэты клубок разблытаць. У нашым выпадку гэта мая задача. Блытаніна-блытаніна, разблытай нас. Не памятаеш?

**Дзяніс.** У інтэрнэце пішуць, што трэба проста фенібут піць.

**Марта.** Ты можаш хоць бензін піць, я проста спрабую растлумачыць, як гэта ўсё працуе.

**Дзяніс.** Як жа, даходліва ўсё. Нават уявіў усё гэта наглядна.

**Марта.** І што скажаш?

**Дзяніс.** Незадоўга да гэтага ад мяне дзяўчына пайшла. Ну як дзяўчына, жонка.

**Марта.** Гэта ўжо добра. Гэта ўжо лепей. Дарэчы, забылася запытацца: ты радаваўся, як я табе раіла?

**Дзяніс.** Канечна. Я спачатку пазначаў нават у тэлефоне, у такія моманты.

**Марта.** Вельмі добра. Так што там з тваёй жонкай? Яна пайшла да больш моцнага, больш мужнага за цябе... у яе вачах?

**Дзяніс.** Думаў, проста ад мяне, хаця зараз я не ўпэўнены.

**Марта.** Пытаюся прасцей. Яна сказала чаму сыходзіць?

**Дзяніс.** Не тое, што прама так сказала. Яно само неяк з сітуацыі было ясна.

**Марта.** Вы пасварыліся?

**Дзяніс.** Мне зараз так есці хочацца, можа наступным разам раскажу?

**Марта**. Наступным, так наступным. Я, шчыра кажучы, таксама слана б з'ела. Можа, ты пачакаеш, пакуль я ў прыбіральню схаджу, а пасля мы разам павячэраем?

**6.**

**Марта.** Нічога, што я з набітым ротам размаўляю?

**Дзяніс.** Калі табе не замінае.

**Марта.** Не. Не хвалюйся. Я проста абажаю гаварыць. І есці таксама абажаю. Я, наогул, вельмі многа ем, больш чым мае сяброўкі, але я не таўсцею. Так?

**Дзяніс.** Па табе не скажаш. так. Ты худая.

**Марта.** Хваравіта худая?

**Дзяніс.** Не, проста стройная.

**Марта.** Скажы!

**Дзяніс.** Можа, калі мы ўсё роўна размаўляем, я б расказаў... Мне ў такой сітуацыі нават прасцей.

**Марта.** Што?

**Дзяніс.** Пра жонку.

**Марта.** Не-не-не. Ні ў якім разе. У гэтым плане ў мяне дакладныя правілы. Работа павінна заставацца на рабоце.

**Дзяніс.** Таксама правільна.

**Марта**. Раскажы лепей пра сябе. Ты любіш есці?

**Дзяніс.** Так, калі галодны, але не так, каб фанацеў.

**Марта.** Зразумела... Я згодна! Усё павінна мець меру.

**Дзяніс.** Іменна.

**Марта.** А што ты любіш есці?

**Дзяніс.** Не ведаю. Мне здаецца я ўсё люблю. У меру.

**Марта.** Не можа такога быць! Не магчыма ўсё аднолькава любіць. Я, напрыклад, піроржнае «бульба». Мне здаецца, я б яго ела і ела, ела і ела, ела і ела...

**Дзяніс.** Разумею.

**Марта.** Таму і кажу, што ў кожнага чалавека павінна быць сваё любімае...

**Дзяніс.** Не ведаю. Можа... Не разумею, чаму я хлушу. Насамрэч, я не вельмі люблю есці.

**Марта.** Не можа быць!

**Дзяніс**. Сур'ёзна!.

**Марта.** Усё роўна не веру.

**Дзяніс.** Не, праўда. Шчыра кажучы, каб была магчымасць зусім не есці, то я б зусім не еў.

**Марта.** Вельмі цікава. Я запішу?

**Дзяніс.** Яда забірае шмат часу, гэта па-першае. Па-другое – гэта сумна, табе трэба сядзець, жаваць, пасля яшчэ і глытаць усё тое, што ты змалоў зубамі і змяшаў слінай. Вось ты калі-небудзь спрабавала, перажаваць што-небудзь, пасля выплюнуць на талерку і зноў гэта з'есці? Гэта ж немагчыма! Ад гэтага і вырваць можа.

**Марта.** О, Божа, не! Гэта ж гадка, ты толькі не падумай, што я набажная. Гэта працівіцца нашай... ну, сам разумееш.

**Дзяніс.** Я і кажу, што гадка. І няважна нават колькі часу прайшло. Можа доля секунды ўсяго, але гэту масу ты ўжо не глынеш...веган ты ці сыраед.

**Марта.** Ніколі пра гэта раней не думала. Ты часта так робіш?

**Дзяніс.** Не. Не вельмі.

**Марта.** Проста гэта дужа цікава, разумееш? Можна так цэлы трэнінг распрацаваць для пахудзення! Збіраеш на пару дзён тых, хто збіраецца худнець і прымушаеш іх вось так есці. А такім чынам многа не з'ясі, ты гэта дакладна сказаў. Ну і гульні якія-небудзь у перапынках, накшталт, заплюшч вочы і падай назад, а мы цябе там падтрымаем. Чур гэта мая ідэя!

**Дзяніс.** Я не прэтэндую.

**Марта.** Абяцаеш?

**Дзяніс.** Без праблем.

**7.**

**Марта.** И так, на чым мы спыніліся?

**Дзяніс.** Мы спыніліся на тым, што я разышоўся са сваёй жонкай. Я доўга думаў...

**Марта**. Ведаеш, давай не так... Давай так: есць што-небудзь пра што ты хочаш пагаварыць? Мажа пра твае панічныя атакі?

**Дзяніс.** Іх пакуль больш не было. Але настрой усё роўна...

**Марта.** Вось і добра! Значацца тэрапія табе на карысць.

**Дзяніс.** Мяне не дае пакою адно пытанне. Але я ў роспачы, ці варта пытацца.

**Марта.** Не сумнявайся! І пазнач сабе дзе-небудзь... Помніш, я казала, каб ты больш радаваўся простым рэчам?

**Дзяніс.** Помню.

**Марта.** Вось туды і пазнач, што табе трэба менш у сябе сумнявацца. Так і напішы: Мне трэба менш у сябе сумнявацца.

**Дзяніс.** Я запомню. Дома адзначу.

**Марта.** Так што за пытанне?

**Дзяніс.** Даюць ці псіхатэрапеўты клятву Гіпакрата?

**Марта.** Гэта пра «не нашкодзь»?

**Дзяніс.** Думаю, так.

**Марта.** Клятву – не. Мы ж не ў Сярэднявеччы жывем. Клятвы – гэта забабоны нейкія. Нам этыка прафесійная... ну, ты разумееш.

**Дзяніс.** Клятва, так, гэта неяк дзіўна.

**Марта.** Ладна. Зараз да пытання. Раскажы, як пайшла твая жонка. Тут важна ўсё, любыя дэталі, якія лічыш важнымі.

**Дзяніс.** Я прыйшоў дадому

**Марта.** А яна што?

**Дзяніс**. А яна за ноўтам сядзела, віно піла. Сказала, што падабрала нейкую польскую мэблю, што трэба даведацца, ці есць на мяжы абмежаванні па вазе.

**Марта.** Вы рабілі рамонт?

**Дзяніс**. Не. Дом будавалі.

**Марта.** Ясна. Працягвай.

**Дзяніс.** А я кажу. Пачакай ты там з гэтай мэбляй, што яна тамака пыліцца будзе. І наогул, я толькі ў хату ўвайшоў, і есці хачу.

**Марта**. Ты ж казаў, што не любіш есці.

**Дзяніс.** Але галодным я ўсё роўна бываю.

**Марта.** Зразумела.

**Дзяніс.** Вось. Ну і... Я вымушаны сказаць, што я прадаў дом.

**Марта.** Вы яго на продаж будавалі?

**Дзяніс.** Не, хацелі тамака дзіця завесці, разумееш, быццам у сваім доме і ўсё такое.

**Марта.** Ты кажы не хаваючыся. Я цябе не асуджаю.

**Дзяніс.** А яна давай раўці, што ужо ўлазіны прызначыла. Тут я і падарваўся, не, на сам рэч, хто наогул улазіны прызначае?

**Марта.** Сапраўды. Я ўдакладню, калі можна, чаму ты дом вырашыў прадаць?

**Дзяніс.** Гэта доўгая гісторыя.

**Марта.** Мне здаецца гэта важным, ведаеш, каб сітуацыю да канца зразумець.

**Дзяніс.** У мяне ёсць малодшы брат. І ён уліп у такую гісторыю, у яго, карацей, знянацку ўзніклі праблемы з правасуддзем і яму спатрэбіліся грошы, каб зрабіць дакументы і з краіны з'ехаць. Да таго ж я дом усё роўна ў плюс прадаў, і адразу збіраўся новы будаваць. Мы па грашах амаль нічога і не згубілі.

**Марта.** Але твая жонка нічога гэтага не ведала?

**Дзяніс.** Не, ды яна ў будоўлі нават і не ўдзельнічала. Карацей, мы сталі з-за гэтага сварыцца. Яна стала крычаць, што я нічога да канца не магу давесці, што я ёй дзіця абяцаў, а дом прадаў. Трусам мяне стала называць, сказала, што пойдзе. Я ёй сказаў, што не варта такімі словамі пасля віна раскідвацца. Тут яна і зусім уз'юшылася. Сказала, што справа не ў віне, а ў тым, што я мудак. Вось так, здаецца.

**Марта.** Што здаецца?

**Дзяніс.** Так яна пайшла.

**Марта.** А ты што?

**Дзяніс.** Я...не ведаю. Здаецца, сеў за стол, даеў сыр, што пасля яе застаўся... і крэкеры.

**Марта.** Ты помніш усё даволі дакладна.

**Дзяніс.** Эта добра?

**Марта.** Гэта не важна. Але ты не хвалюйся, сітуацыя даволі простая. На яе месцы любая бы пайшла.

**Дзяніс.** Так?

**Марта.** Так. Як думаеш, што сказала бы на гэты конт твая маці, каб яна была жывая?

**Дзяніс.** Мая мама жывая.

**Марта.** Тады бацька.

**Дзяніс.** І бацька жывы.

**Марта.** Няёмка атрымалася. Дзіўна, што я раней пра гэта не запыталася.

**Дзяніс.** Вельмі.

**8.**

**Марта.** Справа дакладна не ў гэтым.

**Дзяніс.** Чаму ты так упэўнена?

**Марта**. Дапусцім, гэта прафесійная інтуіцыя.

**Дзяніс.** Ты праўда лічыш сябе прафесіяналам?

**Марта.** Проста гэта было б зусім не цікава. У чым тады мая работа? Да таго ж ты пра гэта хацеў з самага пачатку расказаць, я адразу прасекла. А калі пацыент сам расказаць хоча, то заўсёды атрымліваецца лухта. Гэта быццам бы супярэчыць... ну, ты разумееш... Усё наадварот працуе. Ты не павінен хацець пра гэта расказваць, блок тамака ў цябе ці нешта такое, а я павінна з цябе гэта выцягваць паціху.

**Дзяніс.** Скажам, маеш рацыю. Але што ж, мне зусім нічога не...

**Марта.** А то, што ад цябе жонка пайшла, так гэта таму, што ты паводзіў сябе як мудак, і ў гэтым няма анічога дзіўнага. Я ўпэўнена, ты па ён, нават, і не сумуеш.

**Дзяніс.** Зараз ужо не, але спачатку вельмі цяжка было.'

**Марта.** Да ладна заліваць! Чуеш, пакутнік...

**Дзяніс.** Я проста...

**Марта.** Давай сёння ведаеш, што паспрабуем...

**Дзяніс.** Больш паважлівыя адносіны да мяне і маіх праблем?

**Марта.** Ну ты і нудотны. Сёння я табе нешта накшталт хатняй работы дам. Гэта такое лёгкае практыкаванне. Помні толькі, што яго немагчыма зрабіць няправільна. І вядома аніякіх адзнак і асуджэння з майго боку.

**Дзяніс.** Файная ідэя.

**Марта.** Дома ты напішаш два лісты. Адно – сабе маленькаму. Выбірай любы ўзрост, які захочаш. А другі, быццам бы адтуль сюды, сабе сённяшняму.

**Дзяніс.** Блін! Ты сур'ёзна?! І я за гэта грошы плачу?

**Марта.** Што табе зробіцца? Проста паспрабуй

**Дзяніс.** Мне, па-твойму няма чым больш заняцца? У мяне рэзоннае пытанне ўзнікае. И я, як бы, не дарую сабе, калі не запытаю.

**Марта.** Ты можаш пытацца пра ўсё, што пажадаеш.

**Дзяніс.** Ты наогул доктар? Я ў тым сэнсе...ты які інстытут закончыла, ці нешта ў гэтым родзе?

**Марта.** Сам-та як думаеш?

**Дзяніс.** Я сам ў гэтым вельмі моцна сумняваюся.

**Марта.** Бачыш і ў цябе інтуіцыя таксама добра развіта, але ці табе не становіцца лягчэй ад нашых размоў?

**Дзяніс.** Нічога асабістага. Я проста хацеў ведаць, ці ёсць у цябе адукацыя, таму што я плачу грошы і ўсё такое.

**Марта.** Так, канешне. Я зараз на... як бы табе патлумачыць, каб ты зразумеў... я зараз на другім этапе трэнінгу асабістага росту, і мне трэба было адкрыць сваю справу.

**Дзяніс.** Значыць я ўсё правільна здагадаўся, і ты ніякі не доктар, і нават не блізка..

**Марта.** Сэнс у тым, што трэба быць тым, кім сябе адчуваеш, і нічога не баяцца.

**Дзяніс.** Адчуваеш сябе той, хто можа некаму дапамагчы?

**Марта.** Малой яшчэ марыла псіхолагам быць. Як «Умніца Уілл Хантінг» паглядзела, так і марыла.

**Дзяніс.** Добра. Гэта ўсё міла. А па адукацыі ты хто?

**Марта.** Ціпа бухгалтар. Але па спецыяльнасці ўсё роўна ніколі не працавала.

**Дзяніс.** Ух ты! Дык у цябе нават вышэйшай адукацыі прыстойнай няма!

**Марта.** Я акадэмію кіравання пры Прэзідэнце РБ скончыла. Між іншым.

**Дзяніс.** Пра тое і кажу.

**Марта.** Я самаадукацыяй займалася. Я, мабыць, усе фільмы псіхалагічныя перагледзіла.

**Дзяніс.** Мабыць, бессэнсоўна прасіць цябе грошы вернуць...

**Марта**. Што такое вернуць? Я іх зарабіла, а не скрала!

**Дзяніс.** Тут як бы выходзіць, што я быў трохі ашуканы і ўсё такое...

**Марта.** Не кажы толькі, што нашы сустрэчы табе не дапамаглі.

**Дзяніс.** Я пра тое і кажу.

**Марта.** Ты разважаеш як абывацель. Ці адукацыя галоўнае? Гэта ж рамяство. Вось у Льва Таўстога быццам дыплом быў пісьменніка? Але людзі ўсё роўна аддаюць грошы за яго кніжкі і не адчуваюць сябе ашуканым.

**Дзяніс.** З Таўстым зразумела, але ў нашай сітуацыі, тут як-бы іншае... Скажы, а многа вас такіх? Можа хто з тваіх сяброў-лідзераў таксама нечым такім займаюцца?

**Марта.** Мая партнёрша па трэнінгам пластычнай хірургіяй занялася. Ну як хірургіяй, барадаўкі замарожвае, вусны гелаўронікай накачвае.

**Дзяніс.** Ведаеш, я, мабыць, пас. Досыць з мяне гэтых, як ты назвала іх, размоў.

**Марта.** Але чаму?

**Дзяніс.** Мяркую, што не змагу табе растлумачыць, калі ты сама не зразумела з усяго што ўжо сказана.

**Марта.** Блін... Крыўдна. Столькі ўклала ў цябе.

**Дзяніс.** Гэта так. Нават ня ведаю, што зараз з гэтымі ўсімі ведамі рабіць. І я вось што яшчэ хацеў запытаць.

**Марта.** Хацеў – пытайся.

**Дзяніс.** Ты сама-та псіхатэрапію праходзіла?

**Марта.** Не. Пакуль назапашваю.

**9.**

**Дзяніс.** Ідэя, зразумела трохі дурнаватая, але ўсё роўна ўжо распачаў, так што абое рабое, дурное гэта ці не надта. Я гэта ты, толькі з будучыні. Так што прывітанне, Карась. Я неяк не вельмі добра помню дзяцінства, і ў якім узросце я, гэта значаць ты, пачаў цяміць.

Проста не хочацца пісаць табе туды, дзе ты яшчэ зусім не кемлівы. Прынамсі, усе ўспаміны пра дзяцінства збітыя ў адзін кавалак, і тамака няма асобых знакаў, што мне там было дзесяць, а вось там дванаццаць. Проста ёсць ты і ёсць я. Але ў які момант ты стаў мной я не ведаю. Я сам сябе заблытаў, але спадзяюся, што ты разумееш, пра што я хачу сказаць.

Я не зусім даганяю, пра што заданне. Так, я пішу табе па заданню майго... Карацей, гэта нешта накшталт гульні. Але я не зусім разумею, што менавіта мне трэба пісаць у лісце. Было б значна прасцей, каб ведаць, і мне не давялося пісаць бы так многа. Я памятаю, што калі ты чытаеш, то табе ад гэтага толькі спаць хочацца. Так што бывай.

**10.**

**Марта.** Калі ты зноў па грошы, то я табе, здаецца, ужо ўсё сказала.

**Дзяніс.** Тут як бы справа трохі іная.

**Марта.** Тады кажы, толькі быстра, у мяне пацыент скора.

**Дзяніс.** Іду ў заклад, што няма ніякага пацыента. Ты нават не доктар, ва ўсякім разе!

**Марта.** Тады нашто прыйшоў. Ідзі так з кім-небудзь пагавары.

**Дзяніс.** Было б справядліва менавіта ў цябе запытаць, таму што не я гэта выдумаў і наогул.

**Марта.** Проста хачу, каб ты ведаў, што ў мяне класна ідзе практыка, і пацыентаў у мяне досыць.

**Дзяніс.** Забей, мне ўсё роўна.

**Марта.** Чуеш! Мне тады таксама ўсё роўна з чым ты там прыйшоў, унікнуў! Я цябе выслухаю толькі таму, што ты ўсё роўна не адліпнеш.

**Дзяніс.** Помніш, ты сказала ліст напісаць? Ціпа, адно ў дзяцінства, другой наадварот адтуль?

**Марта.** І што? Не ведаеш з чаго пачаць?

**Дзяніс.** Не, я напісаў адно, тое, што да малога. А другое, якое мне сюды, яно само. Я лёг спаць, прачнуўся, а яно ляжыць.

**Марта.** Досыць зaліваць!

**Дзяніс.** Дзіцячым почыркам. Вось.

**Марта**. Ого, клас! Дай пачытаць!

**Дзяніс.** Даць пачытаць?

**Марта**. Што не так?

**Дзяніс**. Мне здалося, я толькі што сказаў, што не так. Гэта здаецца мне дзіўным. Таму што я нічога не пісаў такога.

**Марта.** Хто тады?

**Дзяніс.** Ты мяне чуеш? Дзіцячая рука напісала! Мне там гадоў 10, мабыць.

**Марта.** Можа ты проста забыўся? А сам піва выпіў, ці яшчэ чаго, вось і почырк іншы.?

**Дзяніс.** Так, я не памятаў нават ўсё тое, пра што ён там кажа, але гэта дакладна ўсё пра мяне.

**Марта.** Пераканаў. Тады гэта дзіўна канешне.

**Дзяніс.** Гэта ўсё?

**Марта.** Што мне табе яшчэ сказаць?

**Дзяніс**. Што мне рабіць з гэтым? Я вар'яцею ці што?

**Марта.** Я бы на тваім месцы аднеслася да гэтага інакш. Не многім даецца такая магчымасць...А, яшчэ забыла запытаць. Ты ў дзяцінстве на самнабулізмам не хварэў?

**Дзяніс.** Ты думаеш, што я як лунацік, устаў, напісаў ліст і лёг спаць?

**Марта.** Гэта б растлумачыла...тады гэта засталося ў сферы маёй кампетэнцыі...

**Дзяніс.** Няма ў цябе ніякай кампетэнцыі1 Ты бухгалтар! Нараіла мне нейкай херні!...Ладна, прабач... Я цябе проста як чалавека прашу...З гэтым нешта трэба рабіць. Гэта ж ненармальна.

**Марта.** Мы маглі б, распачаць гаворку пра тое, што там напісана?

**Дзяніс.** Так, але я так не ўзгадаю, каб дакладна.

**Марта.** Нармальна будзе і ў двух словах. Ты ж не думаеш, што ты там нейкі заклён напісаў?

**Дзяніс.** Не думаю. Напісаў, проста, вітаю, Карась...

**Марта.** Цябе так дражнілі?

**Дзяніс.** Так, напісаў яшчэ...

**Марта.** А за што такую мянушку далі?

**Дзяніс.** Напісаў яшчэ, што ў мяне ўсё добра, каб ён не хваляваўся, што ў будучым у яго ўсё коса.

**Марта**. Ты пра мянушку не кажаш. Ты падсвядома спрабуеш не адказваць? Можа з ёй звязаны нейкі траўматычны вопыт?

**Дзяніс.** Проста дурное пытанне. Ва ўсіх былі мянушкі. Я – Карась, Марк – Кастыль, Арцём – Калена. Я проста рыбачыў добра, мне шанцавала.

**Марта.** А зараз?

**Дзяніс.** Зараз не рыбачу. Сварыліся з жонкай ўвесь час за гэта.

**Марта.** У які ўзрост ты ліст пісаў? Я маю на ўвазе, што ты павінен быў уяўляць сябе неяк дакладна.

**Дзяніс.** Не думаю, што нешта ўяўляў, таму што гэта ж проста ад няма чаго рабіць. Я ж не думаў, што адказ прыйдзе.

**Марта.** А з адказу не зразумела? Я хачу сказаць, што калі ў гэтым ёсць нейкі сэнс, то ўзрост – гэта важна.

**Дзяніс.** Пра ўзрост тут ніяк не зразумела. Проста напісана, што з братам на вёсцы ў бабулі.

**Марта.** З братам, з-за якога дом прадаў?

**Дзяніс.** У мяне адзін брат.

**Марта.** Вось бачыш.

**Дзяніс.** Што бачыш? Нас кожнае лета на вёску завозілі.

**Марта.** Можа варта напісаць яшчэ адзін ліст, калі такая пруха? Ведаеш, накідаць парачку навадных пытанняў, каб зразумець у якім ён часе і што дакладна хоча сказаць.

**Дзяніс.** Яно зараз увесь час так будзе? Я проста па сігналу буду атрымоўваць лісты ад сябе мелкага?

**Марта.** Нішто не замінае рызыкнуць. Гэта ж дзіка цікава ўсё.

**Дзяніс.** Я паспрабую, але, можа, гэта ўсё выпадкова ў першы раз. Ладна, бывай.

**Марта**. Ваў-ваў, пабег! Нічога не забыўся?

**Дзяніс.** У каго ты скнара такая? Нават гадзіны не прайшло.

**Марта.** Акадэмічны прайшоў.

**Дзяніс**. Акадэмічны... Але глядзі што цікава, ніякага другога пацыента так і няма.

**Марта.** Культуры лячэння ў нас проста няма. Вы ўсе праз раз ходзіце.

**11.**

**Дзяніс**. «Вітаю. Сёння ідзе дождж. Таму нас з Марка не пускаюць на двор, каб мы не вэдзгалі гразь туды-сюды. Глядзелі тэлевізар, але ўсё цікавае скончылася, наступнае толькі ў тры гадзіны. Можа, да таго часу дождж і скончыцца. Калі скончыцца, то пойдзем на копанку. Пасля дажджу там рыба заўсёды як звар'яцелая бярэцца. Дробную бабуля ўсё роўна не смажыць. Таму пару дзён яна проста жыве ў нас, гадуецца, а пасля мы выпускаем яе ў возера, тое, што далей, каб яна там разводзілася. Трохі хвалююся, таму што бабуля Наташы сказала, што

тая прыедзе заўтра ці паслязаўтра. Я з мінулага года на яе паглядваю. Яшчэ Марк учора злавіў вожыка, але бабуля сказала, што ў хаце ён у нас жыць не будзе, таму што на ім, у іголках, зараза. На сам рэч ніякай заразы там няма, але яе цяжка пераканаць у чым-небудзь, калі яна наадварот сказала. Пакуль я табе тут пісаў, Марк намаляваў Машыну. Машына атрымалася класная. І яму толькі дзевяць, а ён малюе лепей за мне. Так што пакуль, буду трэніравацца добра маляваць. А то дзесяцігодка так і будзе мяне абмалёўваць. І пальцы ўжо занямелі пісаць. Ніколі не думаў, што калі-небудзь столькі напішу».

**Марта.** Рыба запраўду за пару дзён можа падрасці?

**Дзяніс.** Гэта ўсё, што ты можаш сказаць?

**Марта.** Яшчэ ты быў мілахай.

**Дзяніс.** Так адразу і не скажаш? Так?

**Марта.** Тое, пра што ён кажа, неяк супадае з тваімі ўспамінамі?

**Дзяніс.** Я мала што памятаю.

**Марта.** Ніколі не думаў чаму?

**Дзяніс.** Проста не запаміналася.

**Марта.** Крута, канешне, што табе лісты з мінулага ідуць.

**Дзяніс.** Хутчэй дзіўна.

**Марта.** Я табе зайздрошчу, а ты нават не шануеш, што так адбылося. Раскажы пра гэту Наташу. Якая павінна была прыехаць.

**Дзяніс.** Я ж кажу, што мала помню.

**Марта.** Ну, Наташу помніш?

**Дзяніс.** Наташа як Наташа.

**Марта.** І ўсё?

**Дзяніс.** Наташа, яна, як бы, і была маёй жонкай.

**Марта.** Ого! Так вы з дзяцінства разам?!

**Дзяніс.** Не, я пасля яе знайшоў, у інтэрнэце.

**Марта.** Але любіш яе з дзяцінства?

**Дзяніс.** Не ведаю, мабыць...

**Марта.** Ладна, па-іншаму пытаюся. У цябе былі жанчыны акрамя Наташы?

**Дзяніс.** Так, былі.

**Марта.** Колькі?

**Дзяніс.** Я іх што, па-твойму, лічыў?

**Марта.** Іх было хутчэй многа, ці мала?

**Дзяніс.** Нешта сярэдняе.

**Марта.** Ясна.

**Дзяніс.** Што?

**Марта.** Нічога дакладна, проста ясна.

**Дзяніс.** Можа 10-15, не ведаю, трэба ўзгадаць...падлічыць...

**Марта.** Можаш і падлічыць, але ў прынцыпе гэта ўжо не важна. У лісце пішацца, што малым ты моцна зайздросціў Марку.

**Дзяніс.** Не.

**Марта.** Ціпа, што ён лепей малюе, калі я не наблытала.

**Дзяніс.** Пра малюнак там было.

**Марта.** Ён ва ўсім быў лепей за цябе?

**Дзяніс.** Не быў ён лепей за мяне! З чаго ты ўзяла?

**Марта.** Не, так не. Я проста запыталася. Проста, прадаць дом, які будаваў для сябе, з-за таго, што ён некуды ўляпаўся, гэта, мне здаецца, занадта.

**Дзяніс.** А хто б яшчэ яму памог?

**Марта.** У яго нікога няма акрамя цябе?

**Дзяніс.** Проста ніхто, акрамя мяне не стаў бы.

**Марта.** А табе? Ці ёсць нехта, хто калі што, памог бы табе?

**Дзяніс.** Я стараюся не трапляць у мутныя гісторыі.

**Марта.** І ўсё ж такі мне здаецца, што ты яму зайздросціш.

**Дзяніс.** Гэта з чаго?

**Марта.** Не ведаю, можа бацькі яго ў дзяцінстве больш любілі. Ён усё ж такі меншы.

**Дзяніс.** Можа, але гэта несур'ёзная падстава для зайздрасці дарослага мужчыны.

**Марта.** Ён часта ўклёпваецца ў такія гісторыі?

**Дзяніс.** Пастаянна.

**Марта.** І ты яму заўсёды памагаеш?

**Дзяніс.** Калі магу.

**Марта.** Ты ніколі не думаў, што можа быць ты нічога яму не вінен? Я разумею, што ты як старэйшы брат адчуваеш за яго адказнасць, але ж.

**Дзяніс**. Каб я не меў магчымасці памагчы, то і не рабіў бы гэта.

**Марта**. Гэта для цябе проста?

**Дзяніс.** Для мяне гэта каштавала стасункаў.

**Марта.** Я пра тое ж. Не кожны будзе ахвяраваць адносінамі дзеля брата.

**Дзяніс.** Я ж ня ведаў, што Наташа сябе па-дурному пачне паводзіць.

**Марта.** Я правільна разумею? Ты вінаваціш Наташу?

**Дзяніс.** Не, але каб яна не пайшла, то магчыма і не было б ні атак, ні лістоў гэтых.

**Марта.** Вось, зноў яе абвінаваціў.

**Дзяніс.** Не.

**Марта.** Упэўнена, што так. Я думаю, вам трэба сустрэцца і пра ўсё пагаварыць.

**Дзяніс.** Пра што ўсё?

**Марта.** Альбо проста пагаварыць. Проста знайдзі повад сустрэцца і пабалбатаць.

**Дзяніс.** Які ў гэтым сэнс?

**Марта.** Вось і даведаемся. І яшчэ. Не забывай пісаць лісты.

**12.**

**Дзяніс.** «Сёння павінна прыехаць Наташа. Гэтым разам я ўсё прыдумаў. Я яшчэ зімой прыдумаў. Асталося толькі ўсё зрабіць, але Марк сказаў, што дапаможа, хаця ён крыху баіцца яшчарак. У полі за верхняй вуліцай іх вельмі многа. Мы зловім яшчарку і я падарую яе Наташы. Яшчарка ж не вожык. На ёй заразы няма. Так што яна зможа яе пасля забраць у горад, каб пра мяне пасля ўспамінаць. Таму што я лічу несправядлівым, што я пра яе ўспамінаю, а яна пра мне не. У мінулым годзе мы там бачылі вялізарную яшчарку. Яна была памерам з маленькае кацяня, калі, нават, не з вялікага. Але такая ёй, вядома, не патрэбна. На такую ў горадзе мух не назапасіш. Дождж учора так і не скончыўся. Увечары бабуля прымусіла нас чытаць, пасля ўсё пераказваць. Чытаць вельмі сумна. Але мы з Маркам прыдумалі чытаць у голас навыперадкі. Таму было не вельмі сумна. Марк мяне абагнаў. Але ён чытаў без пачуцця, без ладу і расстаноўкі. Марку была прыемна перамагчы. Але калі чытаць па правілах, то перамог я. Нават добра, што дождж учора так і не скончыўся. Яшчаркі, мабыць, зараз моцна змерзлі і ўсе павылазяць грэцца. Таму злавіць толькі адну, будзе не цяжка, я думаю. Пака».

**Марта.** Гэта ўжо нешта. Здаецца гэта ўжо блізка да нечага важнага.

**Дзяніс.** Ён больш не адказвае.

**Марта.** Чаму?

**Дзяніс.** Мабыць таму, што я яму крышку праўды сказаў.

**Марта.** Якой такой праўды?

**Дзяніс.** Пра Наташу. Што яна будзе яго жонкай, і што не ўсё ў іх будзе добра. Пра прыдзіркі ўсе яе, пра патрабаванні пастаянныя і пра паўсюдную яе нездаволенасць.

**Марта.** Нашто ты ўсё гэта дзіцяці казаў?

**Дзяніс.** Не ведаю, што на мяне найшло. Проста, я на яе трохі злосны.

**Марта.** Ты за сабой ніколі садысцкіх схільнасцей не назіраў?

**Дзяніс**. Досыць. Зараз-та што? У мне зноў атака была.

**Марта.** Ёсць адчуванне, што ты таму і злосны быў.

**Дзяніс.** Ты б радавалася такім рэчам?

**Марта.** Не думаю, што гэта проста так лета і такі ўзрост. Там, дакладна, нешта адбылося.

**Дзяніс**. Я не памятаю, каб дарыў Наташы яшчарку.

**Марта.** Калі дзіця перастала адказваць, то можа ёсць сэнс у Марка запытаць? Можа ён што ўзгадае.

**Дзяніс.** Я не ведаю, як з ім звязацца.

**Марта.** Тады застаецца Наташа.

**Дзяніс.** Наташа не варыянт.

**Марта.** А так атрымоўваецца, што Наташа адзіны варыянт, калі збіраешся даведацца дзеля чаго ўсё гэта было.

**Дзяніс.** Можа проста так? Я да таго, што цалкам можа быць, што гэта ніяк не звязана з панічнымі атакамі, і мы проста ідзем па няправільнаму следу з гэтымі лістамі.

**Марта**. Яна хацела дзяцей?

**Дзяніс.** Так.

**Марта.** А ты?

**Дзяніс.** І я хацеў.

**Марта.** Але вы ўжо не маладыя, вам не па 20, і вы абодва хацелі дзіця. Чаму, як думаеш, у вас іх не было?

**Дзяніс.** Мы не хацелі ў кватэры... Мы жылі, і ў нас раён такі...

**Марта.** Я толькі хачу сказаць, што калі ты не хацеў дзяцей, то ў гэтым няма нічога кепскага.

**Дзяніс.** Але я хацеў.

**Марта.** Проста нехта хоча, а нехта не.

**Дзяніс.** Я хацеў.

**Марта.** Я вось пакуль дзяцей не хачу. Хаця я таксама ўжо не маладуха, так?

**Дзяніс.** Так.

**Марта.** Ты не так павінен быў адказаць.

**Дзяніс.** Я плачу грошы, каб табе нечым павінным быць?

**Марта.** Вось, бачыш, ты зноў нервуешся.

**Дзяніс.** Бачу, нервуюся. І я гэта яшчэ стрымліваюся.

**Марта.** Не стрымлівайся. Ва ўсіх гэтых назапашаных эмоцыях няма нічога добрага.

**Дзяніс.** Такое адчуванне, што ты так гаворыш толькі дзеля таго, каб адцягнуць час. Таму і злую. Ты скачаш з аднаго на другое, пасля на трэцяе, быццам мы на сустрэчы выпускнікоў і сядзім такія бухія за жыццё, ціпа. Ты ўвесь час мяне толькі блытаеш!

**Марта.** Я спрабую намацаць балючыя кропкі.

**Дзяніс.** І што мне з таго?

**Марта.** Досыць наязджаць! Табе здавалася дзіўным, што табе дзіця піша. Зараз ён табе не піша. Што цябе зараз не задавальняе?

**Дзяніс.** Я ў метро амаль не задыхнуўся, і я не ведаю, што з гэтым зрабіць. Вось што мяне не задавальняе.

**Марта.** Зразумей, я за цябе твае праблемы не вырашу. І ніхто не вырашыць. Сэнс тэрапіі не ў тым, каб перакласці адказнасць на доктара.

**Дзяніс.** У нашым выпадку бухгалтара.

**Марта.** Не задавальняе – знайдзі другога. У мяне нервы таксама не жалезныя.

**Дзяніс.** Ты сур'ёзна лічыш, што параіць больш радавацца і быць сабой варта 25 даляраў за гадзіну?

**Марта.** Я дапамагаю людзям прыняць сябе. Гэта не так проста, як табе здаецца.

**Дзяніс.** Што ты памагаеш?! У мяне панічныя атакі і праблемы з перамяшчэннем. Я працаваць нармальна не магу!

**Марта.** Табе трэба нешта зрабіць, каб дзіцё адказала.

**Дзяніс.** Гэта твая парада?

**Марта.** Гэта мая парада.

**Дзяніс.** Не адказвае ён. Што далей?

**Марта.** Прыдумай што-небудзь. Я не магу за цябе ўсё рабіць. Каб ты да мяне прыслухоўваўся і не пісаў зласлівае лайно, то мы бы спакойна ва ўсім разабраліся. Ты сам стварыў праблему – сам павінен яе вырашыць.

**13.**

**Дзяніс.** Я паспрабаваў убачыцца з Наташай.

**Марта.** І як усё прайшло?

**Дзяніс.** Як звычайна ніяк. Я зараз наогул думаю, як я мог гэта гадамі выносіць. Як мы маглі разам нешта планіраваць і ўсё такое.

**Марта**. Менавіта што вынасіць?

**Дзяніс.** Яе раздражненне, нездаволенасць пастаяннае. Яе гэты пакрыўджаную пазіцыю. Я, шчыра, намагаўся, каб усё неяк нармальна прайшло. Але яна з самага пачатку ўсё пачала псаваць. Кветкі для яе не тыя, не такой даўжыні, не таго колеру, не той рэстаран.

**Марта.** Ты не ведаеш якія яна кветкі любіць?

**Дзяніс.** Так, не ў кветках справа. Не важна было якія я кветкі прынясу. Проста, калі яна надумала быць незадаволенай, то яна такой і будзе. І павер мне, зачэпку яна знойдзе.

**Марта.** Мне здаецца, ты перабольшваеш.

**Дзяніс.** Ніскольки. Раней мне, здаецца, падабалася яе неяк супакойваць і гэтак далей. Але зараз не разумею нават , нахалеры мне гэта трэба было. Нашто я ўсяму гэтаму падыгрываў. Яна проста, такім чынам, да сябе ўвагу прыцягвала такім ідыёцкім спосабам.

**Марта.** Можа ты на сам рэч ёй надаваў мала ўвагі?

**Дзяніс.** Колькі мог. Не мог жа я з ранку да вечара каля яе выседжваць і ўсе яе капрызы выконваць. Мне трэба было працаваць, дом будаваць. Зразумела, гэта забірала час. Але ёй жа не 15 гадкоў, праўда? Яна ж магла зразумець, што так яно ўсё і бывае, прычым ва ўсіх.

**Марта.** А пра тое лета, пра яшчарку запытаўся?

**Дзяніс.** Яна не помніць нічога такога.

**Марта.** Яна насамрэч не помніць, ці са злосці так сказала?

**Дзяніс.** Не помніць, а са злосці сказала, што на развод дакументы падае. А пасля папрасіла афіцыянта паставіць ёй усё на суседні столік. І сядзела ела там.

**Марта.** А ты?

**Дзяніс.** І я еў.

**Марта.** Я маю на ўвазе, ты не спрабаваў неяк усё выправіць?

Пагаварыць з ёй?

**Дзяніс.** Стэйк дубянее, калі яго адразу не з'есці.

**Марта.** Яна на самрэч падасць на развод.

**Дзяніс.** Разумею. Дурной думкай было спрабаваць з ёй пагаварыць.

**Марта.** Не ведаю, што і казаць...Ты майстар усё сапсаваць.

**Дзяніс.** Мне тут адна штука здалася дзіўнай. Там у лісце было сказана, што Марк хутчэй за мяне прачытаў... Ціпа мы тамака чыталі ў голас навыперадкі...

**Марта.** А што тут дзіўнага? Ён і маляваў лепей за цябе.

**Дзяніс.** Штука ў тым, што ён, колькі сябе памятаю, заікаецца.

**Марта.** Цікава.

**Дзяніс.** І яшчэ гэта, мабыць апошняе лета было, калі мы разам на вёску ездзілі. Мяне потым у Сувораўскае вучылішча аддалі. Радзей дома бываў, вось і не адпраўлялі.

**Марта.** Так ты ваенны?

**Дзяніс.** Не, не ваенны. Пасля вучылішча я ў палітех пайшоў, а там проста ваенная кафедра. І то я гэта толькі дзеля таго, каб у войска не ісці.

**Марта.** А мне здаецца, ты быў бы сімпотненькім у форме.

**Дзяніс.** Але я і блізка не ваенны.

**Марта.** Але ты такі скрытны, стрыманы. Быццам ваенны. Цябе цяжка раскусіць.

**Дзяніс.** Раскусіць мяне складана, таму што ты не доктар.

**Марта.** Але, шчыра кажучы, мне падабаецца, калі мужчыны такія. Мужчына не павінен быць надта эмацыянальным. Есць такія мужчыны, што на першым сеансе адразу ў слёзы. Увесь ліпкі, плача, абдымацца лезе. Мяне ад такога наогул верне. А ты нічога, трывалы.

**Дзяніс.** Дзіўна ад цябе нешта харошае пачуць.

**Марта.** Чаму дзіўна? Я што, мала табе харошага кажу?

**Дзяніс.** Здаецца, упершыню. А яшчэ у мяне такое адчуванне, што мы топчамся на месцы.

**Марта.** Як думаеш, што можа гэта выправіць?

**Дзяніс.** Каб ведаў, так я б выправіў, так?

**Марта.** А калі добра падумаць?

**Дзяніс.** Сказаў жа, што не ведаю.

**Марта.** Табе патрэбна жанчына, другая палавінка. Жыццё ніколі не будзе паўнавартаснае і насычанае, калі ты адзін.

**Дзяніс.** Я яшчэ жанаты.

**Марта.** Гэта фармальнасць. А я кажу аб адносінах. Кажу пра важнае якое-небудзь знаёмства. Ці аб даўнім... але цікавым. У цябе ёсць хто-небудзь на прыкмеце?

**Дзяніс.** Не, здаецца.

**Марта.** Нічога, я табе дапамагу. Не хвалюйся, гэта задарма. Не магу глядзець, як ты пакутуеш.

**Дзяніс.** Ты пра што?

**Марта.** У мяне ёсць адна...знаёмая. Даволі цікавая. Мне здаецца, што яна б табе спадабалася.

**Дзяніс.** Ты хочаш мяне з некім звесці?

**Марта.** Ну ты скажаш! Не звесці, а пазнаёміць. Які ў цябе дзень на гэтым тыдні вольны?

**Дзяніс.** Гэта абавязкова?

**Марта.** Цябе ніхто не прымушае, але няўжо табе нават не цікава?

**Дзяніс.** Цікава.

**Марта.** Тады ў пятніцу? Столік я сама закажу.

**14.**

**Дзяніс**. І дзе яна?

**Марта.** У яе нешта не зраслося ў апошні момант.

**Дзяніс.** Гэта столік на дваіх.

**Марта.** Але мы ўжо нікога і не чакаем. Так што расслабся.

**Дзяніс.** Ніякай сяброўкі і не было напачатку?

**Марта.** Няма сэнсу хлусіць. Не было.

**Дзяніс.** Тады нашто?

**Марта.** Хацела зразумець, гатовы лі ты да нечага новага. Ці гатовы ты мяняць сваё жыццё.

**Дзяніс.** І што, гатовы?

**Марта.** Таму і выдумала сяброўку, якая быццам табе падыдзе. Сітуацыя, у прынцыпе, ідэальная, і на ідэальную ты павёўся. Так што, думаю, ты да любога павароту гатовы.

**Дзяніс.** А калі зараз паднімуся і пайду?

**Марта.** Я ўпэўнена, ты з абеду адклаў усе справы, каб падрыхтавацца. Дома прыбраўся, так? У душ схадзіў, бялізну прыгожую апрануў. Усё дзеля таго каб падняцца ды пайсці?

**Дзяніс.** Адзежу пасціраў і посуд памыў.

**Марта.** Так што, думаю, мы зараз павячэраем і пасля паедзем да цябе.

**Дзяніс.** Аднак. Так проста?

**Марта.** Не бачу сэнсу ўскладняць.

**Дзяніс.** А дапусціць, што ты не на мой густ?

**Марта.** Каб гэта было так, то якая была б верагоднасць, што ты будзеш працягваць хадзіць на нашы сеансы нават пасля таго, як даведаешся, што у мяне няма дыплому.

**Дзяніс.** Лагічна. Але ты трохі накасячыла са сваімі парадамі, і мне здаецца, што было б правільна, каб ты ўсё выправіла.

**Марта.** Да таго ж не столькі справа густу, колькі...У гэтым дакладна ёсць многа станоўчага. Я ўжо ведаю хто ты і адкрыта на гэта іду, табе не трэба выпендрываца, мачо і ўсё такое.

**Дзяніс.** Мне здаецца гэта не зусім прафесійна так рабіць.

**Марта.** У любым выпадку дзевяноста адсоткаў пацыентаў мужчын выбіраюць сабе ў тэрапеўты жанчыну. І ўсё дзеля таго, каб мець магчымасць такіх фантазій. Ты не такі? Ад цябе пайшла жонка, у цябе нікога няма, і ты ні разу не ўяўляў мяне голай?

**Дзяніс.** Уяўляў. Але я наогул уяўляю голых жанчын.

**Марта**. Усіх?

**Дзяніс.** Не, нейкая сімпатыя павінна быць.

**Марта.** Уяві сабе сітуацыю. Ты зайшоў да сябра ў госці, а ў яго прыгожая жонка.

**Дзяніс.** Гэта не вельмі складана.

**Марта.** І вось ты з ім сядзіш, размаўляеш і ўяўляеш яго жонку голай?

**Дзяніс.** У той момант, калі сяджу ў іх, мушу пра гэта не думаць.

**Марта.** Чаму?

**Дзяніс.** Гэта не зусім правільна, мне здаецца.

**Марта.** Так? А калі гэта лічыцца да месца?

**Дзяніс.** Не ведаю. Я еду пасля дадому і ўяўляю, альбо на наступны дзень, наогул. Яно неяк само выходзіць. Нават не наўмысна выходзіць.

**Марта.** Але ў выніку, ты нашто гэта робіш? Гэта цябе распальвае? Заводзіць?

**Дзяніс.** Проста з зацікаўнасці.

**Марта.** Ты ўяўляеш сэкс?

**Дзяніс.** Не. Проста, быццам партрэт малюю.

**Марта.** З тваіх слоў гэта, лічы, мастацтва.

**Дзяніс.** Быццам ты нічога сабе такога не ўяўляеш.

**Марта.** Часам бывае.

**Дзяніс.** Часам? Да ты ўсю дарогу мне на шырынку глядзіш.

**Марта.** Мне проста неяк здалося, што падчас нашых сеансаў ў цябе была эрэкцыя. Такое магло быць?

**Дзяніс.** У прынцыпу так, але гэта не падстава ўвесь час туды таройкацца. Гэта неяк бянтэжыць.

**Марта.** Ведаць, што ты ідзеш дахаты і ўяўляеш мяне голай не бянтэжыць? І фіг ведае, што ты тамака мне дамалёўваеш, разумееш. Можа, нават, не маі часткі. І нават не ад жаночага цела.

**Дзяніс.** Ад жаночага.

**Марта.** Ты ўяўляў мяне, калі я гэта ўбачыла?

**Дзяніс.** Хутчэй не, пра сваё нешта думаў, зараз дакладна не ўспомню.

**Марта**. Што ж, гэта цешыць. Ты складаеш уражанне выхаванага чалавека.

**Дзяніс.** Ты калі мужчын уяўляеш, ты ўяўляеш сэкс, позу ці ў цябе фецiш з якой-небудзь вопраткай?

**Марта**. Таксама проста цікавасць. Якога памеру, ці ёсць валасы на спіне, таму што гэта важна. Мускулісты ці не, ці ёсць піўны жывоцік і ўсё такое.

**Дзяніс.** А што больш за ўсё бесіць ў целе мужчыны?

**Марта.** Разам мне папаўся качок, ну як качок...ён проста вялікі быў і ўсё расказваў пра залу, трэніроўкі і ўсё такое. А ў выніку апынулася, што ён проста тоўсты. У яго нават на спіне лішнія кіло былі. І срака рыхлая ў друзлых такіх ямачках. Хаця я чытала, што у мужыкоў у прынцыпе цэлюліта не можа быць.

**Дзяніс.** І ў вас усё было?

**Марта.** Як ты разумееш назад дарогі не было. Да таго ж ў яго было, хаця, не важна. Я павінна пра нешта ведаць, што цябе раздражняе ў жанчыне?

**Дзяніс.** Здаецца, няма нічога такога.

**Марта.** Цябе заўсёды і ўсё задавальняе ў сэксе?

**Дзяніс.** Не.

**Марта.** А дакладней?

**Дзяніс.** Есць такія жанчыны, што падчас сэксу гатовы на тэлефонныя званкі адказваць, ці адпісацца дзе-небудзь.

**Марта.** Наташа была такой ?

**Дзяніс.** Не цяжка дагадацца.

**Марта.** Калі мы ўсё ж такі паедзем да цябе, каб я апранула нейкія яе рэчы, ну... там... не ведаю...

**Дзяніс.** Дакладна не.

**Марта.** Проста, калі хочацца, то я магу. Мне ў прынцыпе ўсё роўна.

**Дзяніс.** Я ж сказаў, што не.

**Марта**. А ў мяне будзе просьба. У кантэксце нашай размовы мне гэта будзе вельмі цікава.

**Дзяніс.** Гэта прама не сур'ёзная нейкая ненармальнасць?

**Марта.** Не. Проста, калі ўбачыш мяне голай, паспрабуй параўнаць тое, што ты ўяўляў і тое, што ёсць на самрэч. Толькі адразу не кажы, пасля, калі ўсё скончыцца, скажаш.

**Дзяніс**. Добра. Прэзерватывы?

**Марта.** Так. Ты як, у цябе з гэтым праблем няма?

**Дзяніс.** Не. У цябе нехта ёсць, мужчына, ці муж?

**Марта.** Не. У пошуку.

**Дзяніс.** Актыўным?

**Марта.** Можна і так сказаць.

**Дзяніс.** У цябе абмежаванні ва ўзросце? Я пра тое, што ты хочаш завесці сям'ю і дзяцей да некага дакладнага ўзросту?

**Марта.** Хутчэй па часе. Я табе казала пра трэнінгі. Я зараз як бы на другім этапе. І там, на гэтым трэнінгу сутнасць у тым, што ты вучышся вырашаць праблемы жвава, як лідэр. Ён як бы на тры сферы жыцця. Я такі пакет брала. Можна было болей, але выходзіла даражэй, і я баялася не здолець адразу з усім.

**Дзяніс.** І які ў цябе пакет?

**Марта.** Грошы, адносіны, лідэрскія якасці.

**Дзяніс.** Усяго-та.

**Марта.** На сам рэч усё проста. Бярэшся і робіш. Вось, напрыклад, адносіны. Ёсць чалавек. І ты проста павінен даць адказ на пару простых пытанняў. Хочаш лі ты з ім дзяцей, хочаш лі ты з ім сям'ю. Так, значыць, так. Не, значыць, не. Не мямліць, не пакутаваць, не цярпець. Там толькі ў гэтым сэнс.

**Дзяніс.** І на ўсё ставяцца тэрміны?

**Марта.** Так. Інакш бы я з месца не зрушылася. Нейкі час я ўжо патраціла на грошы і лідэрскія якасці, я адкрыла сваю справу. Зараз засталося з адносінамі разабрацца.

**Дзяніс.** І колькі на ўсё пра ўсё?

**Марта.** Другі этап – год. За гэта час павінен ва ўсім разабрацца.

**Дзяніс.** А калі не атрымаецца?

**Марта**. У мяне атрымаецца.

**Дзяніс.** Ну, а калі не здарыцца?

**Марта**. Тады мяне не возьмуць на трэці этап.

**Дзяніс**. Вядома! Якое жыццё без трэцяга этапу. А там што? Ты ж усё вырашыць павінна за год.

**Марта.** А там новыя мэты, што там яшчэ можа быць.

**Дзяніс.** І грошы ты за гэта працягваеш плаціць?

**Марта.** Плаціць не – ахвяраваць. Са сваімі сённяшнімі заробкамі я магу дзесяць адсоткаў ахвяраваць і не адчуваць гэтага.

**Дзяніс.** Мякка кажучы, трохі надуманы сэнс.

**Марта.** Проста ты ментальны ананіст.

**Дзяніс.** Гэта яшчэ што?

**Марта.** Так трэнер мой кажа пра такіх людзей, як ты. Такія людзі, што ўвесь час сумняваюцца, якія па жыцці на адным месцы ўвесь час і не разумеюць, што трэба рабіць, каб жыццё змянілася. А ведаеш, што трэба рабіць?

**Дзяніс.** Адкуль? Я ж на трэнінгі не хадзіў.

**Марта.** Калі ты апынуўся ў яме, то першае, што ты павінен зрабіць, гэта перастаць капаць.

**Дзяніс.** Нічога наймудрэйшага ў жыцці не чуў.

**Марта.** Праўда?

**Дзяніс.** Мабыць трэба ехаць, нешта забалбаталіся. Тады і глядзі расхочацца.

**Марта.** Трэнер прыкольны вельмі. Я магу цябе запісаць па першы этап па знаёмству, ну, без чаргі. Трэнінг «Абуджэнне» называецца. Рэальна абуджаешся.

**Дзяніс.** І колькі за год трэба па знаёмству запісаць?

**Марта.** Дзесяць. На трэцім этапе, кажуць, трэба больш.

**Дзяніс.** Ну...так выбываюць жа.

**15.**

**Дзяніс.** Ён мне зноў напісаў.

**Марта.** Я ж казала што перамены важны. Ты унутранне прабачыў сабе разрыў з Наташай, таму што ў цябе паявілася я.

**Дзяніс.** Можа быць.

**Марта.** Ты рады, што напісаў?

**Дзяніс**. Нават ня ведаю.

**Марта.** Што піша?

**Дзяніс.** Напісаў пра кеды, харошыя новыя кеды, якія мы з Маркам знайшлі на вёсцы.

**Марта.** Ты ўжо нешта расказваў пра кеды.

**Дзяніс.** Мы былі на футбольным полі і знайшлі новыя кеды. Але яны мне былі малымі, а яму вялікімі. І я, дзеля рогату, звязаў на іх шнуркі і закінуў іх на провад. Я нават не думаў, што атрымаецца. І другі раз наўрад лі стаў кідаць. Але папаў з першага. Прама перакруціліся там за провад і павіслі.

**Марта.** А далей.

**Дзяніс.** Далей я ўсё прыгадаў.

**Марта.** Што прыгадаў?

**Дзяніс.** Той дзень і наогул... як мы хадзілі за яшчаркай.

**Марта.** Вы ўсё ж такі яе злавілі?

**Дзяніс.** Наташа жыла на верхняй вуліцы. А поле, на якім яшчаркі, яно было трохі далей, за футбольным полем. Тамака яшчэ чорная рабіна расла, я там ўпершыню ў жыцці кляшча падчапіў. Ён мне ў шыю ўгрызся.

**Марта.** Ты пачынаеш пераскокваць. Мне трохі складана.

**Дзяніс.** Не пераскакваю я, а проста кажу.

**Марта.** Добра кажы, як табе зручна. Можаш з сярэдзіны, можаш з канца.

**Дзяніс.** Тамака, на верхняй вуліцы, як бы, свая тусоўка была. Мы з імі не надта вадзіліся. Нас без таго трохі недалюблівалі, за тое, што мы, ціпа, з горада прыехалі. А тут яшчэ нехта з іх убачыў, што я кеды закінуў. А гэта нейчыя там былі кеды. Нехта там проста іх забыўся. Яны проста перагледзелі паміж сабою. «Гэты?».- «Гэты». Мне першаму прыляцела. У паваліўся, таму што не чакаў , што так усё хутка закруціцца, звычайна піхаліся ўсе яшчэ. Ціпа, «што ты?» - «а ты што?». Я падняўся, таму што там Марк яшчэ быў, а ён зусім дробны, яму без варыянтаў было з імі біцца. Калі б гэта не ў полі было, то я б палку якую-небудзь схапіў бы, але там не было нічога такога. Я яшчэ двум паспеў умазаць, перад тым, як мяне канчаткова завалілі. А Марк, стаяў як ўкапаны, відаць, напужаўся моцна, а потым, убачыўшы, што мяне ўсёй аравай валтузяць, знайшоў нейкі камень і ў іх кінуў. Дакладна ў галаву аднаму трапіў, па патыліцы. У яго кроў, ён раве. Я Марку крыкнуў, каб ён уцякаў. Але яго хутка дагналі, падсечкай па нагах, і прыцягнулі назад. Адзін кажа, фіг з ім, ціпа, давай малога накормім, а той няхай глядзіць. Мяне ўтрох трымалі. Той, якому каменнем па галаве прыляцела, дастаў скрыню такую з-пад чарвякоў, узяў адтуль яшчарку, падняў яе за хвост, каб яна яго адкінула. Сеў на Марка, так каленкамі яму ў рукі да зямлі прыціснуўшы, запхнуў Марку гэты хвост у рот і пачаў сківіцай таго так варушыць, каб Марк яе жаваў. Марк сплёўваў, але той знаходзіў хвост, зноў засоўваў Марку ў рот, разам з зямлёй, травой, што, карацей, учапілася. Усё гэта цягнулася, пакуль Марк гэты хвост не з'еў цалкам. А я нічога не мог зрабіць. Мяне моцна трымалі, і я не мог вырвацца, разумееш. Твар мокры, кроў, слёзы, пот па свежым драпінам і ўсё гарыць, і я крычу з усёй моцы, але гэта нічога не мяняе. Цалкам бездапаможным сябе адчуваў.

**Марта.** Я зразумела! Дакладна!! Ты таму есці не вельмі любіш!

**Дзяніс.** Марк пасля гэтага заікацца пачаў.

**Марта.** Ты часта сябе такім адчуваеш? Бездапаможным.

**Дзяніс.** Нядаўна ў мяне быў сонны параліч, ці нешта падобнае.

**Марта.** Можа падчас сэкса ці ціпа такога?

**Дзяніс.** Не! Блін, канешне не! Табе здалося, што ў сэксе я бездапаможны?

**Марта.** Я такога не казала.

**Дзяніс.** Ты менавіта тое казала.

**Марта.** Ты класна займаешся сэксам.

**Дзяніс.** «Класна займаешся сэксам». Хто так наогул кажа? Давай шчыра. Ты кайфуеш, калі мы сэксам займаемся?

**Марта.** Я не буду хлусіць, добра? У мяне, наогул, у прынцыпе, ад сэкса з мужчынамі задавальнення аніякага.

**Дзяніс.** Цікава.

**Марта.** Не. Ты толькі не ўспрымай на свой рахунак, ладна. Гэта задоўга да цябе яшчэ, гэта заўсёды так было.

**Дзяніс.** Табе падабаюцца жанчыны?

**Марта.** Не. Не пра гэта. Проста я там неяк устроена, разумееш.

**Дзяніс.** Не разумею.

**Марта.** Ты ведаеш, што такое вумбілдінг?

**Дзяніс.** Жаночы бодзібілдзінг?

**Марта.** Не. Гэта калі ты намагаешся кіраваць мышцамі похвы. Ну вумбілдінг, гэта калі ты асэнсавана ўсё робіш і правільна. Я з самага маленства так мастурбіравала, і рабіла гэта не зусім правільна, таму я не магу атрымліваць асалоду з мужчынамі. Але я вельмі хутка магу сама, таму я не бачу праблемы. У крайнім выпадку можна да сэксолага звярнуцца.

**Дзяніс.** Проста, тады да канца не зразумела, нашто тады табе мужчына?

**Марта.** Каб ён пра мяне клапаціўся, увагу праяўляў і ўсё такое. Прынамсі, адна не зацяжарыш. Чаму мы наогул пра гэта гаворым?

**Дзяніс.** Не ведаю, здаецца, ты сама гэта пачала.

**Марта.** Я не магла. Таму што мне здаецца, што ты нешта важнае ўзгадаў. Мне здаецца, гэта ключ і на гэтым трэба зараз засяродзіцца. Покуль з галавы ўсё не выветрылася.

**Дзяніс.** Звычайна, калі да нечага важнага дакопваюцца, хіба не плачуць?

**Марта.** Тут маеш рацыю, плачуць. Табе не хацелася?

**Дзяніс.** Здаецца, не.

**Марта.** Але адно мы дакладна высветлілі. З-за чаго ты не любіш есці. Што яшчэ ты на гэты конт адчуваеш?

**Дзяніс.** Дзіўна было б пра гэта не ўзгадаць.

**Марта**. Так, цябе ж пабілі. Я б такое дакладна не забылася.

**Дзяніс.** Ты дакладна.

**Марта.** Ну, вось, глядзі. Гэта не толькі праблемы з ядой тлумачыць. Ты не змог абараніць малодшага брата, ты яму, можна сказаць, здрадзіў. Так?

**Дзяніс.** Іх было болей, і я фізічна нічога не мог зрабіць.

**Марта.** Болей-меней, гэта не адмяняе таго, што ты яго абараніць не змог.

**Дзяніс.** Не змог абараніць, так. А здрада тут пры чым?

**Марта.** Так ты даслухай. Усё гэта твая падсвядомасць некуды схавала. Заблакіравала гэты ўспамін, ты ўвесь час адчуваў пачуццё віны, але ніяк не мог зразумець яе вытокі.

**Дзяніс.** Я...

**Марта.** Не перабівай пакуль... Блін... Пачуццё віны, але ты не мог зразумець яе вытокі... так... хваляванне там... гэта ўсё... Так, і гэта, такім чынам, тлумачыць. Ты прадаеш дом, каб неяк вызваліцца ад пачуцця віны, але твой брат з'язджае, і ты застаешся без механізму, як яго апекаваць, каб увесь час загладжваць пачуццё віны. Гэта цалкам магло справакаваць панічныя атакі.

**Дзяніс.** Файна, што ты можаш упэўнена казаць пра дакладныя рэчы.

**Марта.** Сур'ёзна! Дакладныя!? Так не ты ж дакемліў!

**Дзяніс.** Толькі нешта з гэтага ўсяго мая жонка некуды падзелася.

**Марта.** Чаму ты так за яе чапляешся? Нікуды яна не дзелася. Глядзі: жонка яна чаму Наташа? Таму што ты час за часам зноў вяртаўся да гэтага прабелу. Табе нечага не хапала, а Наталля, яна як раз з гэтай заблакаваная гісторыі. Гэта ціпа недзе пабач з прабелам. Да таго ж, мяркуючы па тваіх расказах, яна ўвесь час прымушала цябе адчуваць сябе вінаватым. І гэта зноў жа цябе задавальняла, як і ў адносінах з Маркам. Вось так-та!

**Дзяніс.** І што такога даюць мне гэтыя веды?

**Марта.** Да таго ж гэта тлумачыць і тое, што ў вас няма дзяцей. Ты гэтага баяўся, таму што не змог тады абараніць брата. А бацькоўства – гэта адказнасць, а ты моцна баяўся, што не здолееш, не зможаш адпавядаць.

**Дзяніс.** У цябе, проста-такі, сёння зорны час.

**Марта**. Зноў жа хвост ад яшчаркі... Гэта ж фалічны сімвал, і ўся гэтая сцэна... Карацей, гэта фобія кастрацыі.

**Дзяніс.** Мне здаецца зараз дакладна тут ўсе твае веды скончыліся.

**Марта.** Зараз засталося толькі зразумець, што з гэтымі ўсімі ведамі рабіць далей.

**Дзяніс.** Можа гіпноз ці лобатамію паспрабуем?

**Марта.** Жарты не да месца. У нас з табой сёння прарыў адбыўся, калі што.

**Дзяніс.** Тады я чуў, што абліванні халоднай вадой даюць ня кепскія вынікі.

**Марта.** Табе трэба сябе прабачыць.

**Дзяніс.** І ўсё?

**Марта.** Так, што табе яшчэ трэба?

**Дзяніс**. Ок

**Марта.** Ты не ў чым не вінаваты.

**Дзяніс.** Дзякуй.

**Марта.** Рана ці позна, ты ўсё роўна сябе прабачыш, і ўсвядоміш, што не вінаваты.

**Дзяніс.** Але гэта ж я кеды закінуў.

**Марта**. Але ты не вінаваты.

**Дзяніс.** І з яшчаркай была мая ідэя.

**Марта.** Ты хацеў зрабіць дзяўчынцы прыемны сюрпрыз, што ў тым кепскага.

**Дзяніс.** Тады добра.

**Марта.** Што добра?

**Дзяніс**. Мы ва ўсім разабраліся, і зараз мы можам скончыць усё гэта.

**Марта.** Чуеш, скончыць! Мы толькі напачатку яшчэ... гэтага маршрута.

**Дзяніс.** І што мы будзем далей рабіць?

**Марта.** Што-што! Траўму прапрацоўваць.

**Дзяніс.** Так я ж не вінаваты.

**Марта.** І што яе зараз не прапрацаванай пакінуць?

**16.**

**Дзяніс.** Так, і што гэта такое ўчора было?

**Марта.** І мне цікава. Чаму ты тэлефон адключыў?

**Дзяніс.** Таму што не хацеў размаўляць. Няўжо гэта яшчэ неяк зразумець можна ?

**Марта.** Што мне маме трэба было сказаць па-твойму?

**Дзяніс.** Нашто ты яе наогул прыцягнула? Ты лічыш, што пра такія рэчы не трэба папярэджваць?

**Марта.** Я думала, што табе прыемна будзе. Крэдыт даверу з майго боку. Да таго ж, я не магу свае адносіны ў тайне трымаць ад мамы.

**Дзяніс.** Ты ў мяне запытала, ці хачу я правесці вечар ў кампаніі тваёй маці?

**Марта**. А што за такая праблема для цябе?

**Дзяніс.** Ты ведаеш, што яна мне часала, пакуль ты выходзіла?

**Марта.** Мая мама інтэлігентная жанчына, нічога дужа страшнага яна сказаць не магла. Да таго ж ты ёй спадабаўся. Яна кажа, што ты падыходзіш...

**Дзяніс.** Каму? Ёй што лі?

**Марта.** Мне, пры чым тут яна.

**Дзяніс.** Таму што яна мяне ўпершыню ў жыцці бачыла, а размаўляла са мной так, быццам яна мне жыццё ўратавала.

**Марта.** Адкуль такі вынік? У яе проста ад прыроды голас уладарны.

**Дзяніс.** А тое, пра што яна казала, таксама ад прыроды?

**Марта.** Так, што яна такога табе сказала, не ўцямлю.

**Дзяніс.** Казала, што ў яе з роду ў род ўсе сардэчнікі, і што ёй не вядома колькі засталося, таму я ёй унука вінен.

**Марта.** Мая бабуся ад сэрца памерла.

**Дзяніс.** А твая маці за вечар пачак цыгарэт выпаліла! Адкуль ёй прымроілася, што мы з табой дзяцей плануем?

**Марта.** Каб твае бацькі былі жывы, яны б што, ўнукаў не хацелі б?

**Дзяніс.** Божухна! Мае бацькі жывы!

**Марта**. Прабач. Я не хацела... Вось, у мяне тут нават запісана, што і маці, і бацька, што жывы-здаровы. Галава проста кругам.

**Дзяніс.** Ты на пытанне адказваць будзеш?

**Марта.** Я ёй дакладна не казала, што мы дзяцей плануем.

**Дзяніс.** Тааак.... А мы плануем?

**Марта.** Пакуль не.

**Дзяніс.** Добра, якія тады зараз нашы планы? Як табе здаецца?

**Марта.** Я табе казала.

**Дзяніс.** Ты мне казала, ці мы, дакладна, планавалі?

**Марта.** Казала, але гэта быццам з маіх слоў было зразумела.

**Дзяніс.** І што, як кажаш, мне павінна было быць зразумелым?

**Марта**. Я ж расказвала табе, што я на другім этапу трэнінга, і што мне трэба прыняць нейкія рашэнні.

**Дзяніс.** То бок, ты думала, што я буду прымаць у гэтым удзел?

**Марта.** Я першапачаткова казала, што мне за год, ну не за год, меней ужо засталося. Што мне трэба выйсці замуж.

**Дзяніс.** Ты сур'ёзна? Мы два разы пераспалі і ўсё.

**Марта**. Па-першае, не два.

**Дзяніс.** Я вобразна.

**Марта.** Не разумею, што цягнуць, мы не кепска ладзім, і, здаецца, падыходзім адно аднаму, нават мама сказала.

**Дзяніс**. Я ў гэта ўпрагацца не буду.

**Марта.** Як гэта зразумець?

**Дзяніс.** Як хочаш. Проста я не буду ў гэта ўпрагацца. Я яшчэ нават і не разышоўся, напрыканцы.

**Марта.** Ты ж казаў, што ўжо заўтра.

**Дзяніс.** Але і заўтра не буду. Неа.

**Марта.** Так не робіцца. Я табе адразу ўсё патлумачыла. У мяне час. Тут засталося нейкіх два месяцы.

**Дзяніс.** Гэта не аргумент.

**Марта.** Што тады аргумент? Я на цябе час марнавала. Я з табой спала, хаця, як ты разумееш, задавальнення ад гэтага аніякага не атрымоўвала. Зараз ты мне вінен даць тое, што я хачу. Адносіны, прынамсі, так і пабудаваны, нешта аддаеш – нешта атрымоўваеш.

**Дзяніс.** Адкуль ты узяла, што я табе нешта вінен?

**Марта.** Не нахабнічай! Я табе дапамагаю, а яшчэ мы з табой пара, гэтага табе недастаткова?

**Дзяніс.** Я табе так скажу. Я табе нічога не вінен.

**Марта.** Вось як?

**Дзяніс.** Так. Я табе грошы плаціў. А астатняе... Астатняе – гэта проста смешна.

**Марта.** Наташе вінен быў.

**Дзяніс.** Мы з ёй былі сям'ёй і шматлікія цэлі ў нас супадалі. Але, калі казаць шчыра, я і ёй нічога не вінен. Ні ёй, ні табе, ні тваёй маме, ні яе маме, разумееш?

**Марта.** Выходзіць, толькі табе ўсе абавязаны?

**Дзяніс.** З чаго так выходзіць? І мне ніхто нічога не вінен.

**Марта.** Ты не мог гэтага раней сказаць. Колькі часу на цябе марнавала. Дзе мне зараз каго шукаць? Усё гэта па новай... расказаць пра сябе, што любіш, што не любіш, а я наогул гэта ненавіджу. Я жалезная па-твойму адно і тое ж увесь час?

**Дзяніс.** Вось нават зараз, ты спрабуеш прымусіць мяне адчуваць, што я вінаваты, і што я табе вінен. Мяне гэта заўсёды прыводзіла ў шаленства. Усе наўкол лічаць, што я ім вінен. Марк, Наташа, зараз ты і, нават, з якога глузду, твая мама. Мяне гэтыя абавязкі заўсёды дабівалі. Таму што гэта пад прымусам ўсё. На мяне проста чапляюць і чапляюць, чапляюць і чапляюць. Ты мужык – таму ты вінен, ты брат – таму ты вінен, ты сын – таму ты вінен. Мяне гэта ўсё дастала. Мне нафіг не патрэбна гэта гара зверху. Я ў аладку амаль ператварыўся. Таму, хочаш злуй, хочаш не злуй, але я толькі сабе вінен. І гэта не праява эгаізму, а здаровы сэнс. Я хачу быць шчаслівым чалавекам, хачу жыць так, як мне хочацца. Вось гэта я сабе вінен. А ўсе астатнія абавязкі робяць мяне няшчасным.

**Марта.** Ведаеш, мне не патрэбен такі мужчына, як разважае, як дзесяцігадовае дзіця. Паміж намі ўсё скончана.

**Дзяніс.** Яшчэ б не скончана! Я табе больш скажу, плаціць табе сёння я не збіраюся.

**Марта.** Гэта з чаго яшчэ? У нас запланаваны сеанс так што гэта не абмяркоўваецца.

**Дзяніс.** Паслухай, мы сёння пра тваю маці гаварылі і пра трэнінгі. Гэта да мяне не мае дачынення. Таму, не.

**Марта.** Што б мы не абмяркоўвалі, ты ідзеш ад мяне з рашэннем, а гэта значыць, што гэта я, мая праца, мая работа дапамаглі табе прыняць гэта рашэнне.

**Дзяніс.** З мяне досыць. Гэта ўжо напачатку было проста смешным.

**17.**

**Дзяніс.** Вітаю, карась. У мяне ўсё добра. Даўно не адчуваў сябе так нармальна. Пішу табе, каб сказаць, што вырашыў нейкі час пажыць на вёсцы. Ведаеш, усе гэтыя лісты і ўсё такое. Усё гэта дзіўна, вядома, але

я тут падумаў, калі і па-сапраўднаму ты недзе ёсць... я заўтра а шостай раніцы на рыбалку пайду на далёкае возера. Вуду я табе, на ўсялякі выпадак, купіў.

**18.**

**Дзяніс.** Гэта самая простая катушка. Вось гэта адшчэпліваеш, калі хочаш зрабіць далёкі закід, пасля леску вось тут пальцам прытрымліваеш, закідваеш і зашчэпліваеш назад. Не бачыш паплавок – тады бліжэй падцягні. Але таксама разлічвай, куды закінуць. Каб не цягаць пасля паплавок па ўсяму возеру.

**Марта.** Ты з кім гаворыш?

**Дзяніс.** Ні з кім... Ты што тут робіш?

**Марта.** Чамадан па траве валаку.

**Дзяніс.** Як ты мяне наогул знайшла?

**Марта.** Па геалакацыі пад тваім фота. Гэта не складана.

**Дзяніс.** І чаго прыпёрлася?

**Марта.** Проста.

**Дзяніс.** Проста? Проста міма праязджала?

**Марта**. Проста пабачыць захацела, праверыць як ты. Можа табе горш стала, ці яшчэ што.

**Дзяніс.** І што, стала?

**Марта.** Я па-твойму на вока вызначаю?

**Дзяніс.** Ясна.

**Марта.** А навошта табе дзве вуды?

**Дзяніс.** Так шанец падвойваецца.

**Марта.** Мяне навучыш?

**Дзяніс.** Вось гэта адшчэпліваецца, калі хочаш зрабіць далёкі закід...

**Марта.** А які трэба?

**Дзяніс.** Любы. Сёння ўсё-роўна не клюе. Дагэтуль усе дні клявала. Можа гэта ад таго, што ты сюды прыехала. Табе як, шанцуе?

**Марта.** Не надта.

**Дзяніс.** Тады пра далёкі закід у інтэрнэце паглядзіш. Проста бярэш вуду. Так. А другой рукой леску адцягваеш трохі і кідаеш. Хай так.

**Марта.** Што далей рабіць?

**Дзяніс.** Проста сядзі.

**Марта.** Доўга?

**Дзяніс.** Калі будзеш балякаць, то доўга.

**Марта.** Як твае атакі?

**Дзяніс.** Мне тут добра.

**Марта.** Добра.

**Дзяніс.** Мг.

**Марта.** Ты ў мяне адзіны быў... у сэнсе пацыент.

**Дзяніс.** Ну, а як ты хацела?

**Марта.** Хацела ўсё з пачатку пачаць. Хацела па-новаму, думала, што ўсё атрымаецца.

**Дзяніс.** У цябе клюе.

**Марта.** Можа ўжо позна?

**Дзяніс.** Так, ужо позна. Адразу трэба было падсякаць.

**Марта.** Ты як прыходзіць перастаў, так мне нават за арэнду не было чым плаціць.

**Дзяніс.** Ты прабач, але я за гэта прабачэнне прасіць не буду.

**Марта.** Я і не думала.

**Дзяніс.** Ты схадзіла павучылася б, можа тады б па-іншаму пайшло бы.

**Марта.** Думаеш варта?

**Дзяніс.** Калі табе гэта трэба, то варта.

**Марта**. Я раней і не рабіла нават, я не расказвала?

**Дзяніс.** А павінна была?

**Марта.** Я палюбоўніцай на ўтрыманні была.

**Дзяніс**. А чаму тады перастаў?

**Марта**. Я ад яго пайшла.

**Дзяніс.** Лагічна. Любы б перастаў.

**Марта.** І ты не запытаеш чаму?

**Дзяніс.** Запытаю. Чаму?

**Марта.** Мне, проста, няма каму расказаць.

**Дзяніс.** Вядома. Каму яшчэ, як не мне.

**Марта.** Ён старэйшы быў. У яго была жонка і дачка. Напачатку яшчэ ён абяцаў, што подзе ад іх, а пасля перастаў. Але я і сама пасля не перапытвалася. Баялася, мабыць. Ён мне кватэру здымаў, рахункі

аплачваў, прыязджаў час ад часу. Высокі такі, інтэлігентны, на Фрэнка Сінатру нечым падобны. У яго клініка свая была прыватная.

**Дзяніс.** Табе жыўца памяняць?

**Марта.** Затым я зацяжарала. Ён ведаў, што аборт рабіць не буду, мы гэта і не абмяркоўвалі, нават. Я напраўду была гатова, каб усё і далей так адбывалася, быццам не разумела, што ўсё гэта не здорава. А пасля ў мяне выкідыш здарыўся. А ў бальніцы сказалі, што выкідыш справакаваў мефіпрыстон, які я прымала. Але я яго не прымала, разумееш? Яго нават у аптэцы не купіць. Ён толькі ў клініках ёсць, і толькі для такіх выпадкаў. Гэта ён усё зрабіў. Прыдумаў так за мяне. Сказаў, што бачыў, што я яшчэ не гатова. Я і пайшла. Пасля дэпрэсія, трэнінгі гэтыя мяне неяк растармасілі. Я ўсё хацела спачатку пачаць. Сама, без нікога, разумееш? Але ў мяне рэдка што атрымліваецца.

**Дзяніс.** Не плач. Яшчэ ўсё атрымаецца. Не перажывай, ну. Больш радуйся і ўсё такое.

**Марта.** Я пажыву тут ў цябе?

**Дзяніс.** Што!?

**Марта.** Проста пажыву, быццам мы сябруем і ты мяне сюды запрасіў на тыдзень ці два. Можам, траўму тваю прапрацоўваць, каб так усё не кідаць. Гэта без грошай, вядома.

**Дзяніс.** Цягні!

**Марта.** Што?

**Дзяніс.** Цягні кажу!

**Марта.** Я казу ўмею даіць, малая умела. Можна казу завесці.

**Дзяніс.** Нашто?

**Марта.** Я думала на вёсках усе каго-небудзь заводзяць.

+375447518448

makeichik@gmail.com

пераклад Вольгі Кавалеўскай

15ok@mail.ru